# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА
# І. А. СІДАРЭНКІ-ПАБУДЗЕЯ

**Перыяд дзеяння:**

канец 1941 г. – чэрвень 1944 г.

**Месца дзеяння:**

в. Бабінічы Віцебскага раёна

**Колькасць:**

7 чалавек

**Кіраўнікі:**

Сідарэнка-Пабудзей Ігнат («Бальшак»)

Дзейнічала ў в. Бабінічы Віцебскага раёна з канца 1941 г. да чэрвеня 1944 г. Налічвала 7 чалавек. Кіраўнік І. А. Сідарэнка-Пабудзей («Бальшак»). У складзе групы былі яго жонка Т. М. Пабудзей, якая працавала загадчыкам бальніцы, медсястра Л. М. Клімянкова, яе сястра Т. М. Клімянкова (Манушына), В. Л. Клімянкова, І. Д. Грубінаў, яго дачка Н. І. Грубінава (Рыжова).

У 1937–1941 гг. Ігнат Антонавіч Сідарэнка-Пабудзей сядзеў у турме. Як вядома, такіх людзей акупанты падбіралі ў свой адміністрацыйны апарат. Падабралі і яго. Але пралічыліся – ён застаўся адданым Радзіме. Службовае становішча бургамістра воласці дазваляла Сідарэнку-Пабудзею з дапамогай членаў групы ўкрываць моладзь ад угону ў Германію, зрываць пасыланне людзей на будаўніцтва розных абарончых збудаванняў, нарыхтоўку прадуктаў харчавання, збор цёплых рэчаў для акупацыйнай арміі і г. д. Падпольшчыкі хавалі ў бальніцы ваеннапалонных, асоб яўрэйскай нацыянальнасці (Сідарэнка-Пабудзей выдаваў дакументы, а яго жонка – даведкі аб хваробах). У 1942 г. падпольшчыкі звязаліся з 1-й Беларускай партызанскай брыгадай, армейскімі разведчыкамі, у 1943 г. – з Віцебскім падпольным гаркамам КП(б)Б, перадавалі ім звесткі аб перамяшчэнні войск па шашы Віцебск – Веліж, папярэджвалі партызан аб планах карнікаў. Раз-пораз усю пошту, якая паступала ў валасную ўправу, Сідарэнка-Пабудзей

перадаваў партызанскаму кіраўніцтву для прагляду і адбору патрэбных дакументаў, забяспечваў партызан бланкамі пашпартоў, у сваёй воласці выдаў дакументы ўсім членам партызанскіх сямей.

Група працавала ў складаных умовах: праз вёску па шашы ішло кругласутачнае перамяшчэнне войск ворага, вакол размяшчаліся буйныя гарнізоны праціўніка.

Побач, на процілеглым беразе Заходняй Дзвіны, пачыналася Суражская партызанская зона, праз якую ажыццяўлялася сувязь партызан з падполлем горада.

Група была звязана з падпольнымі групамі В. С. Кулагінай, І. А. Бекішава, М. Л. Мурашкі і Р. Ф. Махнова. У кастрычніку 1943 г. падпольшчыкі папярэдзілі партызан і часці Чырвонай арміі пра магчымую канцэнтрацыю войск ворага ў раёне Мікалаеўскага і Бабініцкага сельсаветаў, будаўніцтва пантоннага моста цераз Заходнюю Дзвіну, які быў знішчаны савецкай авіяцыяй дзякуючы намаганням падпольшчыкаў.

Група дзейнічала да чэрвеня 1944 г., да дня вызвалення горада. І. А. Сідарэнка-Пабудзей і яго жонка ўзнагароджаны медалямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група І. А. Сідарэнкі-Пабудзея / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 496–497.

2. **Подпольная** группа Сидоренко-Побудея И. А. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 295.